ПРА КАХАННЕ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН 13

ДОБРАГА ДАЖДЖУ ПАКУЛЬ НЕ БУДЗЕ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

2 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 104 (29984)

## КАРОТКА

- Беларусь павысіла экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.
- **У выстаўцы «Белагра» ў бягучым годзе возьмуць удзел 450 кампаній з 10 краін.**
- У Беларусі ўбрана амаль 79 працэнтаў плошчаў траў.
- **Больш за 650 тысяч турыстаў наведала асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі Беларусі ў 2022 годзе.**
- Беларускія навукоўцы распрацоўваюць клетачныя прадукты для лячэння аўтаімунных і анказахворванняў.

- **Шымановіч і Марцінс выйшлі ў другі раўнд парнага разраду «Ралан Гарос».**

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«У гэтым годзе ў нас ужо будзе прыкладна 40 працэнтаў вырабаў медыцынскага прызначэння беларускай вытворчасці. Гэта і нашы расходныя матэрыялы, і новае абсталяванне, і гэтак далей. У лекавых прэпаратах — у нас больш як 50 працэнтаў. І задача стаіць яшчэ больш амбіцыйная. У нас, напрыклад, няма ўласнай вытворчасці імунабіялагічных прэпаратаў, новых прэпаратаў для анкалогіі. Стаіць задача будаўніцтва новых прадпрыемстваў, якія дазволілі б нам мець гэты спектр прадукцыі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У НАС РЫХТУЮЦЬ СІЛАВЫ СЦЭНАРЫЙ ЗМЕНЫ ЎЛАДЫ. МЫ ГЭТА БАЧЫМ. І МЫ ГЭТАГА НЕ ДАПУСЦІМ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з удзельнікамі 52-га пасяджэння Савета кіраўнікоў органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў — удзельніц СНД. На парадку дня — ваенна-палітычная абстаноўка, пытанні бяспекі, супрацьстаянне выклікам і пагрозам. Тэма самая вострая, таму і размова атрымалася прамой і шчырай. «Я не першы раз ужо сустракаюся са спецыялістамі, кіраўнікамі (і ў рамках АДКБ, і ЕАЭС, і гэтак далей), заўсёды, зразумела, напярэдадні любога мерапрыемства думаеш пра галоўнае. Галоўнае ж заключаецца ў тым, што ўсе члены СНД вельмі сур'ёзна ўспрымаюць наш Савет. І тое, што ўсе кіраўнікі органаў бяспекі прыбылі ў Беларусь, сведчыць аб тым, што вы бачыце, што адбываецца вакол нашых граніц, нашай Садружнасці, і вы разумееце, што можа быць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што палітыкі і эканамісты маглі сходзіцца і разыходзіцца, а спецслужбы заўсёды знаходзіліся ў цесным кантакце. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што такога падыходу трэба прытрымлівацца і цяпер.**

Фота БелТА.

### У ВІРЫ БУРНЫХ ПАДЗЕЙ

«Пасля таго як пачалася спецыяльная ваенная аперацыя ва Украіне і супраць Беларусі і Расіі пачалі ўводзіць маштабныя санкцыі, у нашых краінах сёй-той завагаўся, закруціўся, захістаўся і г. д. Гэта, напэўна, натуральна. Вельмі бурныя падзеі адбыліся імгненна, таму некаторы час трэба, каб ацаніць сітуацыю. Але спецыяльныя службы былі заўсёды ў кантакце. Яны дзейнічаюць спакойна, ціха, незаўважна, як і належыць спецыяльным службам. Захад аб гэтых кантактах мала ведае, таму не так шалее і менш прэтэнзій прад'яўляе да вас, нашых саюзнікаў. Ну, а мы з Расіяй апынуліся ў эпіцэнтры гэтых бурных падзей», — адзначыў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што некаторыя краіны, якія завагаліся пасля пачатку спецыяльнай ваеннай аперацыі, не да канца разумеюць сутнасць гэтых падзей.

«Я абсалютна згодны з Прэзідэнтам Пуціным, калі ён гаворыць аб тым, што не мы пачалі гэту вайну. Яна пачалася нават не ў 2014 годзе. Яна пачалася задоўга да 2014 года. Мы бачылі ўсё, што тут адбывалася: той «карычневы» пераварот, які адбыўся, і да чаго Украіну падвадзяць. Бачылі, хто быў у авангардзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён прывёў у прыклад Расію, дзе пачынаючы з 2014 года многія «свядомыя», як іх называюць у Беларусі, былі, крычалі, стагналі, патрабуючы абараніць рускага чалавека на Данбасе. «Яны падштурхоўвалі да гэтага перш за ўсё. І ў нас таксама такія былі. Ну, абаранілі. І дзе гэтыя «свядомыя», разумныя, прасунутыя апынуліся? Хто праз Лачынскі калідор пабег, хто праз Беларусь спрабаваў бегчы, але, балазе, у нас з Расіяй жорсткія правілы... Пачынаюць асуджаць кіраўніцтва Расіі — хто з Ізраіля, хто з Грузіі. А чаго вы асуджаеце? Вы ўчора былі заўзятымі прыхільнікамі гэтай аперацыі. Уявіце сабе: калі б у Мексіцы пачалі здзекавацца з грамадзян ЗША, з амерыканцаў? Той Мексікі даўно б не існавала».

Беларускі лідар падкрэсліў, што ў кіраўніцтва Украіны было шмат варыянтаў зрабіць так, каб людзі жылі мірна. Але ні былыя прэзідэнты, ні цяперашні гэтым не скарысталіся. «Чаму не скарысталіся? Яны што, хацелі вайны? Не. Іх проста штурхалі да гэтага. Знайшлі болевыя кропкі, дзе можна было націснуць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што, калі б гэта не пачалося крыху больш за год таму, пачалося б заўтра, але ў больш горшых умовах для Расіі і Беларусі. Па яго словах, да гэтага ўсё ішло.

«Адзіная, напэўна, наша памылка, што мы не вырашылі гэта пытанне ў 2014-2015 гадах, калі не было ні арміі ва Украіны, ні гатоўнасці... Усе хацелі мірна неяк урэгуляваць. А яны за гэты час стваралі баяздольныя ўзброеныя сілы», — адзначыў Прэзідэнт. Прычым гэты намер ужо быў пацверджаны з боку ўдзельнікаў тагачасных перагавораў па мірным урэгуляванні, у тым ліку былым прэзідэнтам Францыі Франсуа Аландам. «Яны шчыра прызналіся, што яны рабілі ўсё, каб падрыхтаваць Украіну да вайны з Расіяй», — звярнуў увагу беларускі лідар.

СТАР. 2-3

Выпрабавана на сабе

# Патушыць пажар і знайсці чалавека

**Карэспандэнт «Звязды» правяла адзін дзень з ратавальнікамі**

**Падняцца на вышыню 14-павярховага дома, дзякуючы спецыяльнаму інструменту дэблакіраваць пацярпелага ў аўтамабільным ДТЗ, аказаць яму першую медыцынскую дапамогу, апрануцца за некалькі секундаў па трывозе і выехаць на месца здарэння, увайсці ў моцна задымленае памяшканне і патушыць пажар — далёка не поўны пералік таго, праз што давялося прайсці ўдзельнікам семінара для СМІ, арганізаванага Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. Вядома, хоць умовы, у якіх аказаліся журналісты і блогеры, былі набліжаныя да рэальных, усё было максімальна бяспечна, але і гэтага хапіла, каб уявіць, чым кожны дзень займаюцца ратавальнікі, зразумець, наколькі адказная і рызыкоўная ў іх прафесія.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «У НАС РЫХТУЮЦЬ СІЛАВЫ СЦЭНАРЫЙ ЗМЕНЫ ЎЛАДЫ. МЫ ГЭТА БАЧЫМ. І МЫ ГЭТАГА НЕ ДАПУСЦІМ»

## «АСНОВА І ФУНДАМЕНТ — ЭКАНОМІКА І ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗЕЙ»

Аляксандр Лукашэнка папрасіў кіраўнікоў спецслужбаў краін СНД паўплываць на палітыку ў сваіх краінах, каб «мы не разбегліся». Па яго словах, гэта вельмі небяспечна. «Нікому мы не патрэбны, акрамя той постсавецкай прасторы, якая сёння існуе пасля распаду Савецкага Саюза. Фактычна мы размаўляем на адной мове, у нас адзіная эканоміка, у нас адзіныя рынкі, вытворчая кааперацыя і гэтак далей. Для таго, каб гэта стварыць, не хопіць перыяду жыцця ні нашага, ні нашых дзяцей. І навошта ламаць? Навошта ламаць гэты агульны рынак?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. Ён адзначыў, што збліжэнне краін на постсавецкай прасторы прыносіць ім значны эканамічны эфект. У якасці прыкладу прывёў Узбекістан. Супрацоўніцтва з Садружнасцю прынесла яму лішнія 1,5 мільярда долараў, а на сённяшні момант і яшчэ больш. «Значыць, шчасце тут? Ніхто ж вас не паклікаў на іншыя рынкі. Навошта сёння гэта развальваць?» — адзначыў краўнік дзяржавы.

**Ніякай там дэмакратыі няма. Дзякуй богу, мы ўжо ў гэтым пераканаліся. Мы бачылі, як дзейнічаюць у Амерыцы і што яны спрабуюць нам падсунуць. Пад гэтым лозунгам заходнія эліты зробяць усё, каб сарваць любыя інтэграцыйныя працэсы, прымусіць нашыя дзяржавы да адмовы ад партнёрскіх стасункаў, штучна стварыць пункты напружання на прасторы СНД і вакол яе. Самы красамоўны прыклад — цяперашняе становішча Украіны, якую ў геапалітычных гульнях выкарыстоўваюць для размену.**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як спрабаваў пераканаць лідараў Украіны і Грузіі не спяшацца з выхадам з СНД: «Вярнуцца будзе больш складана, а вяртацца давядзецца. І эканоміка нас прымусіць».

Прэзідэнт прывёў яшчэ адзін прыклад: здаецца, для Еўропы, для ЗША Украіна — гэта ўсё, гэта роднае. Заходнія краіны ўсё паставілі на яе. «Дык вы яе падтрымлівайце. А яны ў элементарным... Як толькі Украіна пачала вызваляць свае сховішчы ад збожжа і павезла ў Еўропу, усе закрыліся ад яе. І шалёныя прыбалты, і шалёныя палякі, і славакі нават. Усе закрылі свае рынкі для ўкраінскага збожжа. Чаму? Таму што цэны пачалі падаць на ўласнае. Фермеры абурыліся. Што Украіна прадасць на заходнім рынку? Нічога. Вайна скончыцца — усё роўна прыйдуць да нас», — упэўнены беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што нявызначаная сітуацыя склалася і ў Малдове. З-за недальнабачных рашэнняў мясцовых палітыкаў эканоміка ў краіне пачала згасаць. «Што, зрабілі лепш?» — спытаў кіраўнік дзяржавы.

«Галоўнае, уся аснова і фундамент — гэта эканоміка і жыццё людзей», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «НАС БУДУЦЬ СПРАБАВАЦЬ РАСЦЯГНУЦЬ»

Падчас сустрэчы Прэзідэнт актыўна звяртаўся да канкрэтных фактаў. Па яго словах, на Захадзе, які спрабуе паставіць на калені Расію і Беларусь, пачынае разгортвацца рэвалюцыя. Людзі задаюць пытанні, чаму ва Украіну на забойства людзей аддаюцца вялікія грошы, а самі еўрапейцы жывуць усё горш і горш. «І гэтая тэндэнцыя не проста пачынаецца, а ўжо хутка піку свайго дасягне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Фота БелТА.

Сёння ўжо Захад і амерыканцы хочуць паўзы ва Украіне, каб спынілася там стральба і іншае. Для чаго? Каб выбары правесці. Перш за ўсё ў Злучаных Штатах Амерыкі. Няхай садзяцца за стол перагавораў, і трэба дамаўляцца, каб спыніць вайну, а не шукаць нейкія шчыліны, каб на нейкі перыяд «зацихарыцца», а потым зноў пачаць. Мы гэта ўжо шмат разоў праходзілі. Нас на гэта не купіш», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ваенна-палітычная абстаноўка вакол Садружнасці ўсё больш абвастраецца і будзе абвастрацца: «І нам трэба разумець, што буйныя гульцы вакол нас — Расіі, Беларусі, цэнтральнаазіяцкіх дзяржаў — будуць паціху спрабаваць нас расцягнуць. І па-добраму, і па-дрэннаму. Мы гэтага, мужыкі, не павінны дапусціць. Гэта мой жалезны пункт гледжання. Я гэта нутром ужо чую, усё ж такі не першы год працую Прэзідэнтам. Мы бачым мілітарызацыю краін блока НАТА, якая нарастае, і беспрэцэдэнтную канцэнтрацыю войскаў паблізу нашай з вамі агульнай тэрыторыі, распальванне рэлігійных, узброеных канфліктаў». У пацвярджэнне ён прывёў прыклад Польшчы. Гэта краіна сваё старое ўзбраенне скінула ва Украіну, а цяпер аснашчае сваё войска сучаснай амерыканскай тэхнікай. «Амерыканцы вызначылі Польшчу галоўнай апорай НАТА ў Еўропе. Так, не хачу гэтаму радавацца, але і засмучацца няма чаго, не толькі на нашых межах з Польшчай узнікаюць праблемы — у іх ужо моцная сутычка з Германіяй. Па-мойму, палякі, не маючы на тое падстаў, пачынаюць варочацца, як слон у пасуднай краме. Але гэта іх праблема», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**І гэта ўжо не 2020 год, калі дзяўчынкі хадзілі ў белых кароткіх спаднічках з кветачкамі на дэманстрацыі. Людзі ўжо гатовыя прыйсці сюды са зброяй у руках. Таму нам даводзіцца шмат увагі ўдзяляць абароне нашых рубяжоў.**

Прэзідэнт заўважыў, што ўзмацняецца і без таго магутны палітычны і эканамічны націск з боку ЗША і ЕС, працягваюцца непрыкрытыя спробы абмежаваць навуковае і тэхналагічнае развіццё краін Садружнасці. Разам з тым нарастаюць супярэчнасці паміж Злучанымі Штатамі і Еўрапейскім саюзам. «Амерыканцы не толькі ў вайне на Украіне спрабуюць выкарыстоўваць Еўрапейскі саюз (яны ўжо іх абадралі як ліпку), але і ў супрацьстаянні з Кітаем. А тавараабарот каласальны паміж Кітаем і Еўрапейскім саюзам. І прагматыкі ж, не дурні там усе, разумеюць, што разрыў адносін Еўрасаюза з Кітаем, да чаго падштурхоўвае Амерыка, прывядзе да яшчэ больш сумных эканамічных наступстваў у Еўропе», — растлумачыў ён. Пры гэтым калектыўны Захад выкарыстоўвае ў якасці інструмента ціску міжнароднае права, а калі гэта выгадна — цалкам яго ігнаруе. Але, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, гэтага права практычна ўжо няма.

## ПАД ІНФАРМАЦЫЙНА-ПСІХАЛАГІЧНУЮ ВАЙНУ ПАДВОДЗЯЦЬ УСЁ

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што адной з ключавых пагроз на сёння з'яўляецца інфармацыйна-псіхалагічнае ўздзеянне, распаўсюджванне ад пачатку лжывай, фэйкавай

### ❍ У тэму

Фота БелТА.

## «МЫ КАНСТАТУЕМ, ШТО ЎЗРОВЕНЬ ЭСКАЛАЦЫІ РАСЦЕ»

У размове з журналістамі старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі Іван Тэртэль заявіў, што абстаноўка, якая застаецца складанай, будзе ўскладняцца і ў далейшым. «Таму патрэбна выпрацоўка дадатковых сумесных мер нашых дружалюбных спецслужбаў для купіравання пагроз, якія фарміруюцца цяпер», — адзначыў ён. У ліку пагроз застаюцца такія традыцыйныя, як тэрарызм, наркатрафік, а таксама з'яўляюцца новыя, звязаныя з ваенна-палітычнай абстаноўкай у рэгіёне. Гэтыя і іншыя пытанні, паводле слоў Івана Тэртэля, абмяркоўваюцца сярод спецслужбаў краін СНД, выпрацоўваюцца агульныя меры. «Нягледзячы на ўсе абставіны, мы дапамагаем вырашаць розныя праблемы, здабываем інфармацыю, якая дакладваецца кіраўнікам дзяржаў і на падставе якой прымаюцца ўзважаныя неабходныя стратэгічныя рашэнні ў сферы гарантавання нацбяспекі нашых незалежных дзяржаў», — расказаў ён.

Старшыня КДБ нагадаў пра намер прыняць дадатковыя меры па ўзмацненні контрразведвальнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. Па яго словах, гэта мера рэалізоўваецца цяпер па ўсім перыметры нашай граніцы. Яна накіравана на своечасовае выяўленне і лакалізацыю дзейнасці асоб, якія выношваюць тэрарыстычныя, экстрэмісцкія памкненні адносна Беларусі. Па словах Івана Тэртэля, КДБ атрымлівае інфармацыю аб наяўнасці рэальных планаў сярод асоб з баявых груп, сфарміраваных на тэрыторыі Украіны, Польшчы, Літвы, Чэхіі, некаторых іншых краін, аб здзяйсненні тэрактаў у Беларусі. І, па яго словах, узмоцнены кантроль на граніцы — толькі адзін са складнікаў, які дае магчымасць праводзіць пэўнае фільтраванне гэтага кантынгенту і не дапускаць на нашу тэрыторыю злачынцаў. Красамоўны нядаўні прыклад — прадухіленне спробы тэракту да 9 Мая, калі ў Беларусь пад выглядам бытавой тэхнікі накіроўваліся выбуховыя рэчывы. «На жаль, гісторыя не завершана. Мы актыўна працуем па ўсіх напрамках. Думаю, што нашы грамадзяне па даручэнні кіраўніка дзяржавы праз пэўны перыяд даведаюцца і аб іншых новых фактах», — адзначыў Іван Тэртэль.

Паводле яго слоў, у асноўным нядобразычліўцы Беларусі цяпер сканцэнтраваны за мяжой і абапіраюцца на тых збеглых, якія знаходзяцца ў Вільнюсе, Варшаве. Нядаўна КДБ атрымана інфармацыя з Заходняй Еўропы аб чарговых фінансавых запытах збеглых. Яны запыталі на найбліжэйшы час 230-250 мільёнаў долараў на сваю падрыўную дзейнасць адносна Беларусі. «Некаторыя з заходніх палітыкаў і службовых асоб іх падтрымліваюць, іншыя абураюцца, паколькі фінансавыя рэсурсы, якія могуць выдзеліць, запатрабаваны ў гэтых краінах на іншыя нацыянальныя мэты. Я б, карыстаючыся выпадкам, раіў фіскальным і кантрольным органам ЗША, Польшчы, Літвы, Германіі, некаторых іншых краін вельмі ўважліва паглядзець на пытанні фінансавання з бюджэту фондаў, якія з'яўляюцца пракладкай для фінансавання падрыўной дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Вакол іх склалася цэлая праслойка людзей, якія прафесійна займаюцца адмываннем грошай. Гэта, напэўна, прадмет для ацэнкі праваахоўных структур гэтых дзяржаў», — сказаў кіраўнік КДБ. Ён падкрэсліў, што органы дзяржбяспекі Беларусі гатовы процідзейнічаць пагрозам, у тым ліку сумесна з калегамі з краін СНД.

Таксама Іван Тэртэль па просьбе журналістаў пракаментаваў атакі беспілотнікаў на Маскву. Але ён папярэдзіў аб закрытасці работы органаў бяспекі і немагчымасці ў сувязі з гэтым раскрываць усю вядомую яму інфармацыю. Ён зазначыў, што органы дзяржбяспекі Беларусі і Расіі працуюць у цесным супрацоўніцтве. «Мы гэтую работу праводзім, валодаем інфармацыяй. Нават падказваем нашым расійскім сябрам і калегам, здабываючы пэўную інфармацыю», — сказаў кіраўнік КДБ. Ён заўважыў, што спроб атакі беспілотнікаў значна больш, чым аб гэтым гаворыцца ў публічнай прасторы. Іх мэта — перш за ўсё пасеяць паніку.

«На жаль, мы канстатуем, што ўзровень эскалацыі расце. І мы да гэтага рыхтуемся як спецслужба. Хачу запэўніць нашых грамадзян, што Прэзідэнт нам ставіць задачы дакладна, па сутнасці, глыбока. Мы дзейнічаем рашуча. КДБ Беларусі працуе, як СМЕРШ — мы вагацца не будзем, настроены рашуча, нас нішто не спыніць. Але мы заклікаем усіх, і ў тым ліку нашых апанентаў, якія за мяжой: трэба адумацца, вырашаць праблемы мірным шляхам, прыходзіць да кансэнсусу па розных аспектах», — падкрэсліў Іван Тэртэль.

інфармацыі. Па яго словах, мэта такіх дзеянняў — падрыў аўтарытэту нашых дзяржаў на міжнароднай арэне.

«Пад фэйкі часам падводзяцца і небяспечныя, агрэсіўныя дзеянні. Вазьміце атакі дронаў на Расійскую Федэрацыю. Што, гэта ў ваенных адносінах нешта значыць? Практычна нічога. А вось пад фэйкі гэта падставіць — быццам і праходзіць. І ў Расіі, і ў нас, яшчэ дзесьці пачынаюць абмяркоўваць: «ах-ах-ах». Таму інфармацыйна-псіхалагічная вайна — гэта аснова, а пад яе падводзяць усё: і эканоміку, і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, і інтэрнэт, і нават узброеныя правакацыі», — адзначыў Прэзідэнт. Па яго словах, фактычная інфармацыйная манаполія Захаду, а менавіта кантроль над інтэрнэтам, асноўнымі сацыяльнымі сеткамі і міжнароднымі СМІ гэтаму толькі спрыяе.

«Адметна, што гэту манаполію, а таксама сваё маніякальнае імкненне не дапусціць стварэння шматпалярнага свету яны прыкрываюць лозунгам барацьбы за дэмакратыю. Нічога за гэтай дэмакратыяй не стаіць. Ніякай там дэмакратыі няма. Дзякуй богу, мы ўжо ў гэтым пераканаліся. Мы бачылі, як дзейнічаюць у Амерыцы і што яны спрабуюць нам падсунуць. Пад гэтым лозунгам заходнія эліты зробяць усё, каб сарваць любыя інтэграцыйныя працэсы, прымусіць нашыя дзяржавы да адмовы ад партнёрскіх стасункаў, штучна стварыць пункты напружання на прасторы СНД і вакол яе. Самы красамоўны прыклад — цяперашняе становішча Украіны, якую ў геапалітычных гульнях выкарыстоўваюць для размену», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, разведінфармацыя, якая паступае ў тым ліку па каналах партнёрскіх сувязяў — спецслужбаў, сведчыць, што пералічаныя пагрозы ў агляднай перспектыве будуць толькі нарастаць.

**Адзіная, напэўна, наша памылка, што мы не вырашылі гэта пытанне ў 2014—2015 гадах, калі не было ні арміі ва Украіны, ні гатоўнасці... Усе хацелі мірна неяк урэгуляваць. А яны за гэты час стваралі баяздольныя ўзброеныя сілы.**

## У СПАКОІ НАС НЕ ПАКІНУЦЬ

«Калі хтосьці з нас думае, што атрымаецца адсядзецца, — дарма. Красамоўны таму прыклад — нядаўнія падзеі ў Казахстане. Там і ўнутраны элемент, як заўсёды. Проста ж на голым месцы не бывае. Заўсёды маецца нейкі ўнутраны элемент. Ёсць сілы, зацікаўленыя ў дэстабілізацыі, вяртанні да ўлады, яшчэ нечага. Але потым вакол гэтага ўнутранага элемента хутка замежныя спецслужбы ствараюць цэлую кучу гэтых элементаў, якія садзейнічаюць дэстабілізацыі абстаноўкі ў нашых рэспубліках. Але прыклад Казахстана і ў тым, што мы тады ўсе аб'ядналіся. І, здаецца, нічога не зрабілі, але толькі ўбачылі нашу рашучасць — адступілі. Таму нам трэба быць адзін да аднаго бліжэй», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

У дачыненні да Беларусі, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у Польшчы, Літве і Украіне вядзецца навучанне членаў незаконных узброеных фарміраванняў, робяцца спробы стварэння спячых экстрэмісцкіх ячэек непасрэдна ў краіне. Пра гэта сведчаць факты. Ён нагадаў пра нядаўнія сумесныя аперацыі з Расіяй, у выніку якіх былі прадухілены тэракты ў Беларусі. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што гэта сведчыць аб тым, што ў спакоі нас не пакінуць.

«Баевікі рыхтуюцца ва Украіне, яны абкатваюцца на фронце. Некаторыя гінуць там з ліку збеглых беларусаў. Рыхтуюцца атрады ў Польшчы, Літве, Чэхіі для таго, каб у патрэбны момант перакінуць у Беларусь. І гэта ўжо не 2020 год, калі дзяўчынкі хадзілі ў белых каротках спаднічках з кветачкамі на дэманстрацыі. Людзі ўжо гатовыя прыйсці сюды са зброяй у руках. Таму нам даводзіцца шмат увагі ўдзяляць абароне нашых рубяжоў», — адзначыў ён.

Як заўважыў Прэзідэнт, раней заходнія кураторы фінансавалі збеглую апазіцыю за заявы ў СМІ, а цяпер патрабуюць актыўных і рашучых дзеянняў. Гэта значыць, грошы ў абмен на тэракты, толькі пад узброеную барацьбу. Аляксандр Лукашэнка параіў усім дзяржавам звярнуць на гэта ўвагу, паколькі датычыцца ўсіх.

«Гэта значыць, у нас рыхтуюць сілавы сцэнарый змены ўлады. Мы гэта бачым. І мы гэтага не дапусцім. Вам добра вядома, у той ці іншай ступені пагрозы датычацца ў тым ліку і вас. Падстаў для правакацый і націску не дапускайце. Любыя дзеянні і рашэнні дзяржаў Садружнасці, якія не адпавядаюць чаканням Захаду, могуць стаць падставай для абвінавачанняў і санкцый. Ваша роля ў гэтай сітуацыі шматразова ўзрастае», — сказаў беларускі лідар.

Адной з пляцовак для выпрацоўкі мер рэагавання на такую палітыку злосніка з'яўляецца Савет кіраўнікоў органаў бяспекі і спецслужбаў краін СНД. «Я абсалютна ўпэўнены, што толькі сумесныя намаганні мы зможам супрацьстаяць гэтай агрэсіўнай атацы і справіцца з любымі пагрозамі. Мы сёння ў стане гэта зрабіць, і на такім узроўні нам трэба трымацца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## КАЛЕКТЫЎНЫ ЗАХАД УЗЯЎ КУРС НА ДЭСТАБІЛІЗАЦЫЮ КРАІН САДРУЖНАСЦІ

Дырэктар ФСБ Расіі Аляксандр Бортнікаў расказаў, што на папярэднім пасяджэнні савета ў мінулым годзе быў зроблены прагноз, як зменіцца аператыўная абстаноўка. Па яго словах, тыя ацэнкі пацвердзілі падзеі гэтага года. «Калектыўны Захад узяў курс на дэстабілізацыю краін Садружнасці

Фота Белта.

і Саюзнай дзяржавы шляхам рэзкага павышэння канфліктнага патэнцыялу на ўсёй прасторы СНД і каля яе межаў», — расказаў ён. На заходнім напрамку паскоранымі тэмпамі нарошчваецца ваенная прысутнасць НАТА. У Польшчу, прыбалтыйскія краіны і Румынію перакідваюцца буйныя воінскія кантынгенты, цяжкая тэхніка і баявая авіяцыя. «Украіна стала плацдармам для вайны супраць Расіі і вядзення падрыўной дзейнасці супраць Беларусі. Да ўдзелу ва ўкраінскім канфлікце заходнікі актыўна падцягваюць Малдову, падбухторваюць яе да сілавой зачысткі Прыднястроўя і Гагаузіі. Паблізу граніцы Саюзнай дзяржавы рэгулярна праводзяцца вучэнні і баявое зладжванне сіл НАТА, а таксама ўкраінскіх і малдаўскіх спецслужбаў», — адзначыў Аляксандр Бортнікаў. Па яго словах, Альянс каардынуе дыверсійна-тэрарыстычную дзейнасць узброеных фарміраванняў і спецслужбаў кіеўскага рэжыму, папаўняе шэрагі УСУ замежнымі наёмнікамі і баевікамі міжнародных тэрарыстычных арганізацый, ажыццяўляе разведвальнае і тэхнічнае забеспячэнне баявых вылазак украінскіх дыверсантаў і агентуры ў адносінах да ваенных і грамадзянскіх аб'ектаў. Аляксандр Бортнікаў таксама звярнуў увагу на спробы атакаваць аб'екты ядзернай энергетыкі і паліўна-энергетычнага комплексу.

«Разам з гэтым Злучаныя Штаты Амерыкі і Вялікабрытанія актыўна працуюць на раз'яднанне краін Садружнасці. Сіламі разведсупольнасці і дыпламатаўніцтваў вядуць работу з палітычнымі і эканамічнымі элітамі дзяржаў СНД. Гэта сённяшняя сітуацыя, яна рэальна складваецца. Мы гэта ўсё бачым. Пад пагрозай другасных санкцый або абяцаннем прэферэнцый імкнуцца ўбіць клін паміж нашымі краінамі, навязваюць пазарэгіянальным гульцам выгадныя фарматы супрацоўніцтва ў сферы абароны і бяспекі», — расказаў Аляксандр Бортнікаў. Па яго словах, пацвярджэнне таму — частыя візіты кіраўніцтва сілавых ведамстваў блока НАТА ў краіны СНД. Паводле яго слоў, амерыканская і брытанская разведкі пры падтрымцы масмедыя і падкантрольных некамерцыйных арганізацый разгарнулі маштабную дзейнасць па падрыхтоўцы ўмоў гвалтоўнай змены ўлады ў краінах СНД. «Мы гэта бачым і прымаем меры, каб нейтралізаваць гэтыя пагрозы», — заявіў дырэктар ФСБ.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «Мы пачалі збіраць плады лёсавызначальных рашэнняў у рамках Саюза Беларусі і Расіі»

**Адзін з фактараў гарантавання бяспекі — устойлівае эканамічнае супрацоўніцтва. Менавіта яму была прысвечана сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з губернатарам Ліпецкай вобласці Ігарам Артамонавым. Гэтымі днямі дэлегацыя рэгіёна з рабочым візітам наведвае Беларусь.**

Вітаючы гасцей, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі і Ліпецкай вобласці ўжо створаны задзел для далейшага пашырэння супрацоўніцтва. Гэта, паводле слоў Прэзідэнта, пацвярджаюць актыўныя кантакты з Ліпецкай вобласцю за апошнія два гады і даныя эканамічнай статыстыкі. Двухбаковы тавараабарот за мінулы год склаўся ў памеры 330 мільёнаў долараў. «Лічба нядрэнная, але, як мы гаворым, паўмільярда лепш. Таму мэта — імкнуцца дасягнуць тавараабароту аб'ёмам 500 мільёнаў. Я думаю, гэту планку мы дасягнём на працягу найбліжэйшага часу. Рэзерваў дастаткова. Тым больш мы ўжо пачынаем, калі можна так сказаць, збіраць плады, не пабаюся такога слова, лёсавызначальных рашэнняў у рамках нашага саюза Беларусі і Расіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што ў гэтай сферы было прынята шмат рашэнняў на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. «Прымаючы лёсавызначальныя рашэнні, мы аказвалі падтрымку нашым урадам і міністрам у развіцці кааперацыі, перш за ўсё прамысловай кааперацыі», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што Расія сур'ёзна рушыла наперад у развіцці сельскай гаспадаркі. Прычым гэта адбылося не без удзелу Беларусі. А цяпер на парадку дня ўзаемнага супрацоўніцтва — высокатэхналагічныя галіны, перш за ўсё мікраэлектроніка.

«Заходнікі сышлі, і дзякуй богу, што сышлі. Мы будзем развіваць сваё. Вы ведаеце, што наша былая краіна, у якой мы ўсе жылі — Савецкі Саюз, — у рынцы-пе абыходзілася незалежна ад Захаду. Проста розуму не хапіла захаваць краіну. Але мы маглі тады, зможам і цяпер», — пераканаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ключавымі напрамкамі эканомікі з'яўляюцца тэхналагічны суверэнітэт і вытворчая кааперацыя. Цяпер да кааперацыі пачынаюць падцягвацца і іншыя краіны, якія былі раней у Савецкім Саюзе. «Мы выпрацоўваем і знаходзім кірункі супрацоўніцтва. І не толькі распрацоўваем канкрэтныя праграмы, але рэалізоўваем канкрэтныя кантракты па стварэнні тых або іншых вытворчасцяў. Гэта значыць, кааперацыя развіваецца, пазітыўны вопыт у нас вялікі. У нас добры базіс для далейшага эканамічнага развіцця», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, маюцца сур'ёзныя напрацоўкі для развіцця кааперацыі з Ліпецкай вобласцю.

«Перакананы, магутным зыходным пунктам можа стаць наша прысутнасць на Ліпецкім трактарным заводзе, дзе мы хочам стварыць сумесную вытворчасць тэхнікі «Амкадор». Гэты брэнд вядомы ў Расіі, вельмі запатрабаваны. Сыход заходніх кампаній вызваляе нам з вамі месца для пашырэння супрацоўніцтва і нашай сумеснай работы», — заўважыў Прэзідэнт.

У Ліпецкай вобласці некалькі гадоў таму пачалі праграму развіцця гарадскога электратранспарту. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта праблема рана ці позна паўстане перад любым горадам Беларусі, Расіі. Гарады становяцца насычанымі, населенымі, таму экалагічна чыстая тэхніка патрэбна будзе ў вялікіх аб'ёмах. «Мы гатовы пастаўляць вам поўную лінейку пасажырскай і сельскагаспадарчай тэхнікі, прычапнога і навяснога абсталявання. Гэта адносіцца і да дарожнай тэхнікі», — запэўніў ён.

Прэзідэнт прапанаваў развіваць супрацоўніцтва ў перапрацоўцы прадукцыі АПК. Перспектыўным ён таксама лічыць супрацоўніцтва ў мадэрнізацыі зернесушыльнай гаспадаркі, у сферы будаўніцтва. «Мы працуем на расійскім будаўнічым рынку. Гатовы любы аб'ект, калі трэба, вам пабудаваць, у чым вы можаце пераканацца асабіста, наведаўшы «Мінск-Арэну», — сказаў ён.

Размова ішла таксама аб падрыхтоўцы да правядзення Дзён Рэспублікі Беларусь у Ліпецку, якія намечаны на восень гэтага года. «Прадставім усё самае найлепшае, каб нашы браты бачылі, як развіваецца Беларусь, і бачылі вынікі нашай сумеснай работы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт запэўніў, што ўсе дамоўленасці, дасягнутыя падчас візіту дэлегацыі Ліпецкай вобласці ў Беларусь, будуць абавязкова выкананы. «Можаце быць на 100 працэнтаў упэўнены, што мы гэта выканаем, рэалізуем. Мы людзі абавязковыя, тым больш гэта ж не дабраччынніасць. Гэта наша жыццё, наша эканоміка. Калі яна працуе, значыць, і краіна будзе развівацца».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ **У тэму**

## У нас будзе дынаміка

Фота Белта.

У размове з журналістамі Ігар Артамонаў падкрэсліў, што супрацоўніцтва паміж Ліпецкай вобласцю і Беларуссю развіваецца па розных кірунках. Напрыклад, кожны другі трактар, які закупляе рэгіён, — беларускай вытворчасці. У рэгіёне любяць беларускія прадукты і бытавую тэхніку.

«Мы абмяркоўвалі магчымасці для беларускіх праекціроўшчыкаў прыйсці на ліпецкі рынак. У Беларусі ёсць сур'ёзныя кампетэнцыі ў выглядзе дзяржаўных праектных інстытутаў, якія сёння востра неабходныя ў Расіі. Шмат мы размаўлялі і аб магчымасцях для беларускіх будаўнікоў прыйсці на нашы сацыяльныя аб'екты», — расказаў губернатар.

Ліпецкай вобласці цікавыя беларускія беспілотнікі, яны актыўна выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы. Бакі абмяркоўваюць і стварэнне сумеснай зборачнай вытворчасці тэхнікі «АМКАДОР» на базе Ліпецкага трактарнага завода.

«Гэта значыць, мы шмат знайшлі пунктаў для судакранання. І, я спадзяюся, у нас будзе новая дынаміка», — адзначыў Ігар Артамонаў. Тавараабарот Беларусі з Ліпецкай вобласцю Расіі стабільна нарастае з 2020 года. У 2021-м ён склаў $315 млн, у 2022-м дасягнуў амаль $334 млн. Пры гэтым беларускі экспарт вырас з $70 млн у 2021-м да больш як $91 млн у мінулым годзе, або на 31 працэнт.

# Патушыць пажар і знайсці чалавека

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На базе Універсітэта грамадзянскай абароны МНС для прадстаўнікоў масмедыя падрыхтавалі некалькі інтэрактыўных пляцовак. Падзяліўшы нас на групы і замацаваўшы за кожнай па інструктары, які суправаджаў экскурсантаў на ўсіх этапах, арганізатары пачалі выпрабоўваць журналістаў і блогераў на трываласць — прычым як фізічную, так і псіхалагічную.

## У задымленым пакоі

Спачатку мы пазнаёміліся з сучасным абмундзіраваннем супрацоўнікаў ведамства. Камплектаў вопраткі ў ратавальнікаў некалькі — кожны прызначаны для выканання пэўных задач. Удалося прымераць баявы касцюм, які ратавальнікі апранаюць, калі выязджаюць на ліквідацыю ўзгарання. Для мяне ён паказаўся цяжкім — яно і не дзіва: не на мой памер сшыты. У такім касцюме не тое што тушыць пажар — рухацца складана. А касцюм, між іншым, ва ўмовах трывогі апранаецца за 18 секундаў. Прычым поўнае абмундзіраванне (з балонам і іншым абсталяваннем, патрэбным пажарнаму) важыць не менш як дзесяць кілаграмаў. Гэта пры ўмове, што апарат сціснутага паветра на ратавальніку — аблегчанага варыянта (да 4 кілаграмаў). Але нярэдка на супрацоўніку ведамства балон вагой у амаль 16 кілаграмаў. Вядома, пра цяжар і нязручнасці ратавальнікам няма калі разважаць: у момант надзвычайнай сітуацыі яны думаюць толькі аб адным — выцягнуць чалавека з агню жывым.

Дарэчы, апынуцца ў задымленым памяшканні, дзе яшчэ і нічога не відаць, а цемру пранізваюць крыкі і стогны людзей, якія трапілі ў бяду, — таксама выпрабаванне не для слабанервовых. Аднак такіх, на шчасце, у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях няма. Мне, журналісту, прызнацца, было страшнавата аказацца ў такой абстаноўцы, хоць яна і была нерэальная. Аднак спецэфекты робяць карціну набліжанай да рэальнай. У такіх умовах вучацца будучыя ратавальнікі.

— Дымакамера прызначана для таго, каб падрыхтаваць ратавальнікаў для работы ў экстрэмальных умовах, — тлумачыць **афіцыйны прадстаўнік Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Андрэй САДОЎСКІ.** — Тым самым мы трэніруем нашых ратавальнікаў для работы ў непрыдатным для дыхання асяроддзі — для таго каб на рэальных пажарах яны ведалі, што ім рабіць, і не баяліся. Гэта адзін з элементаў і псіхалагічнай падрыхтоўкі.

## Чатырохногія героі аперацыі ў Турцыі

Наогул ратавальнікі гатовыя да самых розных надзвычайных сітуацый. У многіх здарэнняў, дарэчы, ёсць сезоннасць. У лесе людзі губляюцца, як правіла, летам і восенню — калі ідуць у ягады ды ў грыбы. Вывіць пацярпелых у лясным гушчары супрацоўнікам МНС дапамагае самая сучасная тэхніка. Рэгулярна ў такіх выпадках выкарыстоўваюцца беспілотныя лятальныя апараты. Дабрацца ў цяжкадаступныя месцы дапамагае ўсюдыход «Шэрп», які на бездарожжы як рыба ў вадзе: ён з лёгкасцю пераадольвае і снег, і лёд, і буралом, і балота, нават пераплывае вадаёмы.

У пошуку людзей у лесе ды і не толькі ратавальнікам дапамагаюць сабакі. Без іх звышздольнасцяў нават прафесіяналам справіцца складана. І гэта пацвердзілі пошукавыя работы па ліквідацыі наступстваў землятрусу ў Турцыі.

Знаёмімся з чатырохногімі гераямі выратавальнай аперацыі. Лабрадоры Дарк і Тая — тыя з пяці сабак, якія разам з ратавальнікамі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» ляталі ў Турцыю.

«Яны ўказвалі кірунак, дзе знаходзіліся жывыя людзі, пасля чаго з дапамогай спецыяльнага абсталявання мы прыступалі да работы, — расказвае **кінолаг атрада Сяргей ЯЗІНСКІ.** — У першыя дні работа ішла вельмі добра, у наступныя сабакам перашкаджаў трупны пах. Мы адчуваем яго, а сабакі тым больш: яны больш адчувальныя, чым людзі. Такога прыбора яшчэ не знайшлі, каб замяніць нос сабакі».

Удзельнікі пошукавай аперацыі ў Турцыі расказалі, што беларускіх сабак «разрывалі на часткі». «Многія хацелі, каб яны папрацавалі і на іх пошукавым участку, — згадвае **ратавальнік Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» Віталь АРЛОЎ.** — Некаторыя нават хітрылі: казалі, што быццам бы пад завалами чуюць голас чалавека. Аднак нашых сабак не падманеш: яны рэагавалі толькі на жывых людзей».

Што датычыцца нашай краіны, кінолагі атрада разам са сваімі гадаванцамі шукаюць людзей, якія згубіліся, па ўсёй тэрыторыі Беларусі — выязджаюць у самы кароткі час. Дарэчы, у цяжкадаступныя месцы сабака дэсантуецца беспарашутным спосабам разам з кінолагам. На балансе падраздзялення — чатыры пароды сабак: лабрадоры, нямецкія аўчаркі, бельгійскія аўчаркі і бельгійскія пойнтары.

## Чырвоная «хуткая»

Паспрабавалі журналісты і дэблакіраваць пацярпелага ва ўмоўным дарожна-транспартным здарэнні. Быццам паперу, рэзалі жалеза спецыяльнымі нажніцамі, пры дапамозе іншага абсталявання спрабавалі выцягнуць «пацярпелага» з машыны. Паводле легенды арганізатараў, ён быў без прытомнасці. На той момант жыццё чалавека, хай умоўнага, знаходзілася ў руках журналістаў. Правільна акажам першую медыцынскую дапамогу — ён будзе жыць, разгубімся або будзем панікаваць — ці рабіць рэанімацыйныя мерапрыемствы няправільна — страцім чалавека.

Дарэчы, на здарэнні, дзе ёсць пацярпелыя, ратавальнікі выязджаюць са сваімі медыкамі. На балансе МНС знаходзяцца аўтамабілі медыцынскай службы — тая ж хуткая дапамога, толькі не белага, а чырвонага колеру.

— Наша хуткая дапамога абсталявана па класе рэанімабіля, — расказвае **ўрач хуткай медыцынскай дапамогі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» Віктар ЛІТВІН.** — Тут ёсць усё неабходнае: дэфібрылятар з кардыяманітарам, апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх, кардыёграф, шыны, насілкі і іншае. Мы не выязджаем на звычайныя выклікі — толькі разам з ратавальнікамі на месцы надзвычайных сітуацый. Таксама займаемся навучаннем супрацоўнікаў МНС навыкам першай медыцынскай дапамогі.

Падчас семінара журналісты даведаліся і пра асаблівасці работы ратавальнікаў на вышыні, ўзбраенні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Адным словам, семінар адкрыў перад журналісцкай супольнасцю ўсе тонкасці прафесіі ратавальніка, дазволіў хоць бы на кароткі перыяд адчуць сябе ў ролі прафесіянала, які нясе адказнасць не толькі за сябе і сваіх калег, а і за жыццё людзей.

— Мы аналізавалі наша ўзаемадзеянне са сродкамі масавай інфармацыі, глядзелі, якім чынам сёння асвятляецца не проста дзейнасць Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, а ў цэлым роля дзяржавы па абароне людзей ад надзвычайных сітуацый, — кажучы аб мэтах семінара для СМІ, адзначыў **афіцыйны прадстаўнік МНС Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Зыходзячы з гэтага, мы зрабілі выснову, што ёсць пэўныя нюансы недагаворанасці. Падчас семінара мы расказалі, што дзейнасць нашага ведамства не зводзіцца толькі да ратавання людзей пры шматлікіх здарэннях. Гэта вялікая работа:

паназіраліі за спаборніцтвамі прадстаўнікоў зборнай каманды па пажарна-выратавальным спорце, азнаёміліся з асноўнымі ўзорамі аварыйна-выратавальнай і спецыяльнай тэхнікі, якая стаіць на пачынаючы ад фарміравання культуры бяспекі жыццядзейнасці і заканчваючы дапамогай нашым грамадзянам, якія трапілі ў бяду.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Уладзіміра ШУБЫ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Мінабароны РФ: УС Расіі сарвалі спробу ўварвання ўкраінскіх баевікоў у Белгародскую вобласць

Тэлеграм-канал Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі ўчора паведаміў пра тое, што ў ноч на чацвер, «пасля інтэнсіўнага абстрэлу грамадзянскіх аб'ектаў у Белгародскай вобласці, украінскія тэрарыстычныя фарміраванні сіламі да дзвюх мотапяхотных рот, узмоцненых танкамі, распачалі спробу ўварвання на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі ў раёне населенага пункта Новая Таваліжанка і міжнароднага аўтамабільнага пункта пропуску «Шабекіна». Актыўныя дзеянні расійскіх вайскоўцаў дазволілі адкінуць праціўніка, парушэнні дзяржграніцы не дапушчаны, рэзюмавала міністэрства.

Губернатар Белгародскай вобласці Уладзіслаў Гладкоў расказаў пра восем параненых жыхароў Шабекіна ў выніку начных абстрэлаў з боку Узброеных сіл Украіны. Напярэдадні з Шабекінскай акругі пачалі арганізаваны вываз дзяцей і сямей з малымі дзецьмі ў іншыя расійскія рэгіёны. Для жыхароў Шабекінскай акругі падрыхтаваны пункты часовага размяшчэння ў сталіцы рэгіёна.

### Еўрапарламент ухваліў рэзалюцыю супраць старшынства Будапешта ў ЕС

Рэзалюцыя, якая патрабуе ад Савета ЕС не даць Венгрыі прыняць старшынства ў 2024 годзе з-за «невыканання законаў і каштоўнасцяў ЕС», носіць рэкамендацыйны характар. «Парламент падкрэслівае важную ролю старшынства ў Савеце ў прасоўванні заканадаўства, забеспячэнні пераемнасці парадку дня ЕС і прадстаўленні Савета ў адносінах з іншымі інстытутамі. Узнікае пытанне, як Венгрыя зможа надзейна выканаць гэту задачу ў 2024 годзе, улічваючы невыкананне ёю законаў і каштоўнасцяў ЕС, а таксама прынцыпу шчырага супрацоўніцтва. Таму Еўрапарламент просіць Савет знайсці належнае рашэнне і нагадвае, што можа прыняць адпаведныя меры, калі такое рашэнне не будзе знойдзена», — адзначаецца ў дакументе.

### У ніжняй палаце Кангрэса ЗША прыняты закон аб павышэнні мяжы дзярждоўгу

Ініцыятыва прадугледжвае павышэнне мяжы дзярждоўгу да студзеня 2025 года ў абмен на правядзенне прапанаваных Рэспубліканскай партыяй рэформ. Сярод іншага яны ўключаюць пераразмеркаванне сродкаў, выдзеленых на надзвычайную дапамогу пры пандэміі COVID-19, а таксама пераразмеркаванне часткі фінансавання Службы ўнутраных даходаў ЗША.

Як папярэдзіла раней кіраўнік амерыканскага мінфіна Джанет Елен, адміністрацыя можа вычарпаць надзвычайныя меры ў сувязі з дасягненнем максімуму дзярждоўгу ўжо 5 чэрвеня. У такім выпадку, як неаднаразова падкрэслівалася, краіна сутыкнецца з дэфолтам, які прывядзе да «эканамічнай катастрофы» ў самой краіне і выкліча ўзрушэнні ў сусветнай эканоміцы.

Сядзі і глядзі

# Белтэлерадыёкампанія пакажа канцэрты «Маладзечна-2023»

**Сёлета 9 і 10 чэрвеня пройдзе XXII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023». Дзякуючы трансляцыям асноўных канцэртных праграм і аператыўным выпускам навін гледачы тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 3» змогуць пранікнуцца атмасферай форуму і нават пабываць на яго галоўнай канцэртнай пляцоўцы.**

З 9 да 11 чэрвеня «Навіны культуры» на сацыякультурным канале будуць выходзіць у фармаце дзённікаў Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023». Карэспандэнты пабываюць на мерапрыемствах музычна-паэтычнага форуму, пагавораць з удзельнікамі і арганізатарамі, пакажуць сюрпрызы, падрыхтаваныя для жыхароў і гасцей горада. А вынікі свята даведаемся ў нядзелю ў праграме «Культурны тыдзень».

Цэнтральнай падзеяй першага дня стане ўрачыстае адкрыццё XXII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023» «Усе зоркі зышліся» на сцэне Летняга амфітэатра. У канцэртнай праграме возьмуць удзел артысты тэлевізійных праектаў «Х-Фактар» і «Фактар.by». Яны выступяць у суправаджэнні Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі імя М. Я. Фінберга». Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор — Максім Расоха. Тэлеверсію канцэрта-адкрыцця фестывалю пакажа канал «Беларусь 1» 9 чэрвеня ў 21.45. На наступны дзень 10 чэрвеня ў 11.30 і 15.30 на «Беларусь 3» глядзіце прамыя трансляцыі II і III тураў рэспубліканскага этапу Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні «Маладзечна-2023» са сцэны Палаца культуры.

Завершыцца фестываль гала-канцэртам «Любімыя песні. Спяваем разам» на сцэне Летняга амфітэатра. У праграме возьмуць удзел Анатоль Ярмоленка, Уладзімір Громаў, Ірына Дарафеева, Вікторыя Алешка, Жанэт, Нацыянальны акадэмічны народных хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча і іншыя. У рамках канцэрта пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні «Маладзечна-2023». Атрымаць асалоду ад вялікага святочнага канцэрта гледачы тэлеканала «Беларусь 1» змогуць 10 чэрвеня ў 21.50.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 173

Наш чытач Васіль Жуковіч з Мінска прапанаваў змясціць прыгожую мініяцюру расійскага складальніка Д. Кларка, якая была зроблена ў далёкім 1879 годзе *(гл. дыяграму)*.

**Белыя:** Крd1, Фg4, Лd2, Сg8, Кa6 (5).

**Чорныя:** Крe5, пе6 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мінску адбыліся першынствы Беларусі сярод дзяцей да 8 і 10 гадоў. Прызёрамі сталі:

хлопчыкі да 8 гадоў — 1) Кірыл Жук (Гомель); 2) Павел Поўх (Мінск); 3) Ян Муліца (Кобрын);

хлопчыкі да 10 гадоў — 1) Дамір Булгак (Мінск); 2) Леў Сіўко (Гомель); 3) Ціхан Трафімчук (Брэст);

дзяўчынкі да 8 гадоў — 1) Аляксандра Віцюк (Мінск); 2) Ксенія Ластаўка (Мінск); 3) Ульяна Стаброўская (Мінск);

дзяўчынкі да 10 гадоў — 1) Анастасія Севасцянчук (Мінск); 2) Марыя Салюк (Брэст); 3) Аліса Малюш (Гродна).

* * *

У Сочы адбылося 30-е камандное першынство Расіі (прэм'ер-ліга), дзе выступалі і беларускія зборныя.

У мужчын каманда Беларусі фінішавала на чацвёртым месцы з дзесяці. У чатырох матчах нашы шахматысты перамаглі, тры прайгралі, а два звялі ўнічыю (з першым і другім прызёрамі, адапаведна, зборнай Масквы і маскоўскім СК КПРФ). На шостай дошцы Максім Царук набраў 6 балаў з 9, на сёмай Арцём Стрыбук — 4,5 з 7. На першай дошцы Дзяніс Лазавік завяршыў унічыю ўсе 9 партый. Па 50 працэнтаў матчавымых балаў набралі таксама Міхаіл Нікіценка, Вячаслаў Зарубіцкі і Арцём Сіняўскі, горш выступілі Аляксей Аляксандраў і Аляксей Фёдараў.

У жаночым турніры беларуская каманда заняла сёмае месца з 14 (5 перамог, 3 пройгрышы, 1 нічыя). Варвара Палякова набрала 5,5 бала з 9, Ксенія Зелянцова — 6 з 9, Аляксандра Тарасенка — 4 з 7. На рахунку Ксеніі Норман — 50 працэнтаў балаў, горш выступіла Яна Ільючык.

* * *

У Мінску прайшла ўніверсіяда з удзелам 30 камандаў беларускіх ВНУ. Першыя шэсць месцаў занялі адпаведна Беларускі ўніверсітэт фізічнай культуры, Беларускі эканамічны ўніверсітэт, Белдзяржуніверсітэт, Беларускі ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт і Віцебскі медыцынскі ўніверсітэт.

* * *

Прызавую тройку рэспубліканскага турніру «Белая ладдзя» склалі каманды мінскіх гімназій № 16 і № 6, аршанскай гімназіі № 2.

На дзіцячых спартыўных гульнях гарадоў-герояў у Маскве каманда Брэста заваявала «бронзу» (саступіўшы толькі Маскве і Санкт-Пецярбургу), а шахматысты Мінскай вобласці былі восьмыя.

У турнірах па бліцы на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 15-е месца з 580 і 22-е з 449, Сяргей Жыгалка — 4-е з 497.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Kf5! Правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цялпук. М. Кошаль прапануе пераставіць белага каня на g1: атрымліваецца задача-блізня, дзе да мэты вядзе 1. Kh3.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Сваё кіно

# СМЕХ, СЛЁЗЫ І ЖЫЦЦЁ

**У праграме перадач на наступным тыдні значыцца шэраг фільмаў, якія сёлета наблізіліся да знакавых юбілейных дат, а значыць, кожны з іх ужо прайшоў выпрабаванне часам, густамі гледачоў і нават самыя розныя закадравыя перыпетыі, каб некалі з'явіцца на свет. Прапаноўваем больш падрабязна спыніцца на некаторых з такіх кінастужак.**

У эфіры тэлеканала «Беларусь 3» убачым, напрыклад, адзін з любімых у аўдыторыі фільмаў, што адносіцца да класікі беларускага кінематографа, — народную камедыю **«Белыя росы»** (1983 г.) ад рэжысёра Ігара Дабралюбава. Хоць мы і неаднойчы згадвалі гэтую работу, пераглядаць яе — заўсёды сапраўднае задавальненне. Бо фільм — наглядны прыклад таго, як пры ўдалым супадзенні таленту многіх людзей атрымліваецца кіно на дзесяцігоддзі. Таму ніколі нялішне зноў перагледзець гісторыю, увасоблену на экране выдатнымі акцёрамі (Усевалад Санаеў, Мікалай Караванцаў, Генадзь Гарбук, Стэфанія Станюта і іншыя), каб паразважаць над уласнымі ўзаемаадносінамі з роднымі, прыслухацца да сябе і спытаць, ці сапраўды я цяпер там, дзе мне добра і ўтульна, і ў рэшце рэшт пайсці за поклічам сэрца, даўняй марай. І калі хочацца адчуць настальгію па нечым няспраўджаным і разам з тым нотку аптымізму ды веру ў здольнасць змяняць любыя абставіны, плануйце прагляд у аўторак 6 чэрвеня.

А вось у чацвер, 8 чэрвеня, на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць прыгодніцкі дэтэктыў **«Чорны прынц»** (1973 г.). Гэты фільм з'явіўся як адказ на вялікі інтарэс аўдыторыі да першай часткі «Вяртанне «Святога Лукі» (1970 г.). Зняў яе таксама рэжысёр Анатоль Баброўскі. Сюжэт працягу прыгод палкоўніка міліцыі Зорына знаёміць нас з гісторыяй разблытвання чарговага злачынства, звязанага з крадзяжом каштоўнага каменя... І хоць мы ўсе помнім або здагадваемся, што зрабіць тое ў яго атрымаецца, паназіраць за гэтыміакалічнасцямі адназначна варта. Другая частка трылогіі з Усеваладам Санаевым у галоўнай ролі ў свой час у часопісе «Савецкі экран» была ацэнена так: «Фільм займальны, і інтрыга яго дакладная, і дэталі выверaны». Таксама адзначылі, што кінастужка прывабліваe «праўдай адлюстраванага — праўдай чалавечай, маральнай». Ухвалілі кінакрытыкі і эвалюцыю вобраза галоўнага героя, які, «аказваецца, зусім не пазбаўлены гумару, здольны іранізаваць», і ўвогуле што іграе акцёр Санаеў надзвычай удумліва, асэнсавана і гарманічна існуючы ў прапанаваных сюжэтам абставінах. Працяг кінааповеду выйшаў на экраны пад назвай «Версія палкоўніка Зорына» ў 1978 годзе. Зняў яе на кінастудыі «Масфільм» рэжысёр Андрэй Ладынін. Раім паглядзець таксама іншыя прыгоды любімага кінагероя.

Тым часам тэлеканал «Расія-Культура» прапануе мастацкі фільм **«І жыццё, і слёзы, і любоў»**, які з'явіўся на «Масфільме» ў 1983 годзе. Кінаработа рэжысёра Мікалая Губенкі паглыбляе гледача ў аповед пра жыццё пастаяльцаў аднаго з дамоў ветэранаў, калі туды прыязджае новы галоўны ўрач Варвара Дзмітрыеўна (ролю выконвае Жанна Болатава). Паказваючы быццам бы звычайныя бытавыя эпізоды, стваральнікі стужкі нагадваюць кожнаму пра важнае ды вечнае: павагу, спагаду да тых, хто побач, любоў да сваёй справы і ўсведамленне, што вярнуць жаданне жыць здольныя неабыякавыя людзі... Не прапусціце глыбокі, кранальны кінааповед у панядзелак днём.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**


## Лета ў радасць са «Звяздой»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2023 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 ліпеня 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем набораў садовага інструмента WMC Tools TG 1001001 і суперпрыз — камплект садовай мэблі Sandays LUC-TA21. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 29 ліпеня 2023 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або на II паўгоддзе 2023 года. Пасля 30 верасня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 101 ад 30 мая 2023 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4317 ад 12.05.2023 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2023 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
*(аддзяленне сувязі)*
на III квартал або II паўгоддзе 2023 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
*(абавязкова)* *(індэкс)*

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
